Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

# ГРАФІКА (СТАНКОВАЯ, ПРЫКЛАДНАЯ)

**Вучэбная праграма**
**для студэнтаў спецыяльнасці**
**1 - 17 02 01 “Народная творчасць”,**
**напрамак:**
**1 - 17 02 01-07 «Народныя рамёствы»**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Рынкевіч У.І. - прафесар кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Шаура Р.Ф. - доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў .

Лойка.Г.В. – дацэнт, загадчык кафедры методыкі адукацыі і мастацтва Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта ім. М.Танка.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 11 ад 28.06.2012 );

Навукова метадычным саветам УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № ад )

© Рынкевіч У.І., 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне курса беларускай станковай і прыкладной графікі з'яўляецца неад'емнай часткай вучэбнага працэсу па засваенню нацыянальнай культурнай спадчыны і набыццю мастацкага прафесіяналізму развіццю творчага патэнцыялу будучых спецыялістаў у галіне народнай творчасці. Мастацкі вопыт, набыты студэнтамі спецыяльнасці “Народная творчасць”, напрамак "Народныя рамёствы" на папярэдніх курсах ў працэсе засваення дысцыплін цыкла выяўленчага мастацтва (жывапіс, малюнак, кампазіцыя, колеразнаўства і інш.) з'яўляецца базісам вывучэння дысцыпліны "Графіка". Шырокая распаўсюджанасць станковай і прыкладной графікі ў мастацкай і культурна-асветніцкай галінах сацыяльнага жыцця, асабліва ў аматарскай мастацкай дзейнасці друкаванай, абумоўлівае значэнне курса для падрыхтоўкі будучых мастакоў. яе вялікі патэнцыял уздзеяння на фарміраванне ідэйна-эстэтычных густаў грамадства вызначаюць важную ролю гэтага віду мастацтва ў сацыяльна-культурнай сферы жыцця, што ўказваюць на актуальнае укараненння прапанаванага курса ў вучэбны працэс вядучай вышэйшай навучальнай установы культуры Рэспублікі Беларусь.

Змест дысцыпліны дае магчымасць студэнтам паглыбіць і пашырыць веды і навыкі ў галіне графікі як аднаго з асноўных відаў выяўленчага мастацтва. Прапанаваныя для вывучэння тэмы абагульняюць тэарэтычны і практычны матэрыял, які назапашаны ў беларускім мастацтве, а таксама навуковага даследавання аўтара па гісторыі развіцця беларускай графікі. Выкарыстоўваюцца работы, па тэхналогіі вырабу друкаваных формаў тыражнай і арыгінальнай графікі, даследаванні айчынных і замежных вучоных.

У аснову праграмы курса пакладзены прынцып комплекснага падыходу ў вывучэнні графічнага мастацтва. Такі падыход дае магчымасць прасачыць не толькі эвалюцыю графікі ў матэрыялах і тэхналогіі, але і скласці аб'ектыўнае ўяўленне аб працэсе фарміравання відава-жанравай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структуры і стылёва-вобразных кірунках сучаснай станковай графікі, вызначыць найбольш значныя творчыя дасягненні мастакоў у сучасны перыяду развіцця нацыянальнай культуры.

Вывучэнне курса студэнтамі прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

– абагульненне і папаўненне ведаў па эвалюцыі графічнага мастацтва;
– азнаямленне з тэхналогіяй вырабу тыражнай графікі ў працэсе стварэння твораў;
– набыццё пачатковых навыкаў правядзення навукова-даследчай работы ў галіне графікі.

Аптымальным рэжымам засваенне матэрыялу з'яўляецца вывучэнне дысцыпліны "Графіка" на працягу двух семестраў. Засваення ведаў і навыкаў дасягаецца міжпрадметнымі сувязямі з дысцыплінамі "Гісторыя выяўленчага мастацтва", "Малюнак", "Кампазіцыя" і інш.

Тэарэтычныя, практычныя і самастойныя заняткі прапануецца праводзіць у наступных формах:

– акадэмічныя лекцыі (як ва ўмовах акадэмічнай аўдыторыі з паказам арыгіналаў, дыяпазітываў або копій графічных твораў, так і ў музейным ці выставачным асяроддзі);
– напісанне рэфератаў з элементамі навуковага даследавання;
– семінарскія заняткі;
– экскурсіі ў музеі, архівы, выставачныя залы, творчыя майстэрні мастакоў;
– творчая праца ва ўмовах графічнай майстэрні.

Па заканчэнні курса формай кантролю ведаў і навыкаў з'яўляецца экзамен або залік. Змешчаны прыблізны спіс пытанняў для самастойнага кантролю ведаў і спіс асноўнай і дадатковай літаратуры.

Прапанаваны курс прызначаны для студэнтаў спецыялізацыі 3 – 4 курсаў, якія навучаюцца па  спецыяльнасці "Народная творчасць" і можа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паспяхова выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе іншых мастацкіх спецыяльнасцяў ВНУ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| *Тэма* | *Усяго аўдыт* | *Лекцыі* | *Лаб.* |
|---|---|---|---|
| 1. Эвалюцыя станковай графікі ў відах, тэхналогіях і індывідуальных творчых манер мастакоў.. | 18 | 2 | 12 |
| 2. Разнастайнасць вобразна-стылістычных тэндэнцыі сучаснай станковай графікі | 18 | 2 | 12 |
| 3. Відавая структура прыкладной графікі. | 10 | 2 | 8 |
| 4. Стыль, як асноватворны элемент распрацоўкі комплексных аб'ектаў прыкладной графікі. | 18 | | 18 |
| *УСЯГО* | **56** | **6** | **50** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ

Тэма 1. **Эвалюцыя станковай графікі ў відах, тэхналогіях і індывідуальных творчых манер мастакоў**

Графіка як асобны від творчасці ў структуры марфалогіі мастацтва. Роля, месца і структура станковай графікі ў выяўленчым мастацтве. Спецыяльны тэрміналагічны апарат: графіка, малюнак, рысунак, гравюра, эстамп. Спецыфіка выразных сродкаў графікі: лініі, танальныя плямы, колеры, матэрыялы і інструменты. Віды арыгінальнай графікі (малюнак, манатыпія). Віды эстампа (гравюра, афорт, літаграфія). Разнастайнасць

друкаваных тэхнік графікі. Спецыфіка жанраў, сюжэтаў і вобразаў графічнага мастацтва. Графіка як мастацтва прасторавае (пластычнае), выяўленчае, якое адлюстроўвае свет у бачных вобразах і не патрабуе часавага кампанента. Вытокі і этапы эвалюцыі станковай графікі.

*Лабараторныя заняткі*

*Заданне 1.1.*

Структурны аналіз твораў графікі. Практычнае выкарыстанне метадаў мастацказнаўчага даследавання. Вызначэнне тэмы, задач, пошук крыніц эмпірычнага матэрыялу для даследавання графікі. Вывучэнне індывідуальных творчых манер беларускіх мастакоў шляхам стварэння копіі твора арыгінальнай станковай графікі, выкарыстоўваючы матэрыялы нацыянальнай графічнай спадчыны.

*Заданне 1.2*

Распрацоўка эскізу экслібрысу Вывучэнне эмпірычнага матэрыялу па дадзенай тэме. Збіранне дакументальнага, фактычнага і эцюднага матэрыялу. Эскізная распрацоўка экслібрысу. Выбар тэхнікі выканання і спосабу тыражыравання прадукцыі.

Тэма 2. **Разнастайнасць відаў і вобразна-стылістычных тэндэнцыі сучаснай станковай графікі**

Традыцыйныя і эксперыментальныя формы графікі ў перыяд станаўлення савецкага выяўленчага мастацтва. Станковая графіка ў новых сацыяльна-гістарычных умовах. Графічнае мастацтва "віцебскага рэнесансу". Уздым гравюрнага мастацтва ў тэхніцы абразнога дрэварыту. Станаўленне акадэмічнай мастацкай адукацыі ў рэспубліцы. Малюнак і друкаваная графіка ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме. Адраджэнне мастацтва афорту і літаграфіі ў міжваенныя дзесяцігодзі. Хранікальна-дакументальны малюнак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваеннага часу як феномен выяўленчага мастацтва. Спецыфіка відаў і графічных тэхнік, жанравая разнастайнасць і тэматычная праблематыка творчасці беларускіх графікаў у пасляваенны перыяд. Каляровы эстамп. Тэматычныя кірункі ў развіцці друкаванай графікі. Аднаўленне адукацыйнай сістэмы падрыхтоўкі мастакоў-графікаў. Патрыятычны пафас і ідэалагічная тэндэнцыйнасць станковай графікі 1919 – 1959 гадоў.

Графічная спецыялізацыя ў мастацкіх навучальных установах Беларусі. Фарміраванне сучаснай беларускай школы графікі ў 1960 - 1980-я гады. Выставачная дзейнасць беларускіх графікаў. Лінагравюра чорна-белая і каляровая. Дэкаратывісцкая тэндэнцыя і фальклорны пачатак у эстампах. Пашырэнне ідэйна-вобразнага патэнцыялу беларускага эстампа. Мастацкія індывідуальнасці і нацыянальны стыль беларускай графікі.

Месца і роля станковай графікі ў мастацкім жыцці рэспублікі 1960 – 1980 гады. Гісторыка-рэвалюцыйная, ваенна-патрыятычная, фальклорна-нацыянальная і вытворчая тэматыкі як асноўныя складальнікі тэматычна-вобразнай сферы графікі. Літаграфія, афорт ( у разнастайнасці відаў – сухая іголка, акватынта, меццатынта). Сімвалізм і метафарызм у графіцы Станковая ілюстрацыя па матывах літаратурных твораў

Разнастайнасць тэхнік арыгінальнай графікі. Акварэль традыцыйная і сучасная. Графічная і жывапісная тэндэнцыі акварэлі. Віцебская лакальная школа акварэлі. Малюнак алоўкавы і тушавы. Мяккія матэрыялы ў станковай графіцы (вугаль, пастэль, соус, сепія). Пастэльны малюнак. Манатыпіі. Выкарыстанне камп'ютэрных тэхналогій ў станковай графіцы.

*Лабараторныя заняткі.*

*Заданне 2.1* Стварэнне арыгінала малой графікі (экслібрыс, станковая ілюстрацыя) на аснове вывучэння індывідуальных аўтарскіх манер (Я.Мініна,А.Тычыны, Г.Грака) і тэхнік працы ў арыгінальным выкананні (пяро, туш).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 2.2.* Стварэння аўтарскай творчай працы ў адной з тэхнік арыгінальнай або друкаванай графікі на аснове вывучэння індывідуальных манер мастакоў (А.Паслядовіч, А.Лось, Г.Паплаўскага, Л.Марчанкі, А.Кашкурэвіч, Л.Асецкі і інш.)

Тэма 3. **Відавая структура прыкладной графікі**

Агульныя звесткі аб прыкладной графіцы. Класіфікацыя і структура прыкладных відаў графікі. Разнастайнасць утылітарнай мастацкай прадукцыі. Ілюстрацыя (кніжная, часопісная), плакат (тэматычны рэкламны, інструкцыйны), вырабы прамысловай графікі (упакоўка), святочнае афармленне (лозунгі, пано, стэнды), інфармацыйная графіка (камунікацыйная, інструкцыйная), рэкламная. Асноўныя характарыстыкі выяўленчага дакумента. Асаблівасці друкаванай прадукцыі: плакат, лістоўка, канверт, паштоўка, паштовыя маркі, закладкі, альбомы. Тэкст у прыкладной графіцы. Выбар і абгрунтаванне спосабу друку (асаблівасці друкарскага абсталявання Сфера выкарыстання машыннай графікі.

Віды камп'ютарнай графікі. Колер і каляровыя мадэлі. Праграмнае забеспячэнне для стварэння і прагляду графічнай інфармацыі. Магчымасці тэкставых і графічных рэдактараў.

*Лабараторныя заняткі.*

*Заданне 3.1.* Аналіз формастваральнай сістэмы дызайн-аб'ектаў розных тыпаў і відаў. Вызначэнне семантычнай структуры, ключавых сімвалаў і знакаў. Кампазіцыйная структура мадэлі, кампазіцыйны цэнтр (першасны, другасны), сілавая лінія кампазіцыі, рытмы, асаблівасці лінейнай пластыкі. Лакальныя колеравая гама і дамінуючыя сэнсавыя колеры.

Тэма 4. **Стыль, як асноватворны элемент распрацоўкі комплексных аб'ектаў прыкладной графікі.**

Фірменны стыль ў сучасным карпаратыўным свеце як апазнавальны знак кампаніі і эфектыўны маркетынгавы інструмент. Праяўленне стылю ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

афармленні бланкаў, канвертаў, карпаратыўныя і персанальныя візітоўкі, бэйджы, папкі, форменнай вопраткі, шаблону прэзінтацый, інтэр'ераў службовых памяшканняў і экстэр'ераў будынкаў.

Фактары, якія спрыяюць стварэнню паспяховага фірменнага стылю. Этапы і спецыфіка распрацоўкі фірменнага стылю установы, арганізацыі, прадпрыемства ў сферы культуры і адукацыі. Базавы камплект фірменнага стылю: знак-лагатып, фірменная каляровая гама, шрыфтавая гама.

Лагатып як знакавая графічная выява, адзін з важнейшых элементаў іміджу кампаніі. Абнаўлення фірменнага знака на аснове аналізу графічных і колеравых мадыфікацый папярэдніх гадоў, Эвалюцыя знакамітых лагатыпаў, канструяванне дызайну будучага.

*Лабараторныя заняткі*

*Заданне 4.1 (12 гадзін)*

Распрацоўка фірменнага знака, лагатыпа адной з установ сферы культуры, адукацыі або мерапрыемства, якія арганізуюцца гэтымі установамі (фестывалю, конкурсы, выстаўкі і іда т.п.).

*Заданне 4.2 (16 гадзін)*

Распрацоўка асноўных кампанентаў фірменнага стылю для адной з установ культуры: дом рамёстваў, цэнтр народнай творчасці, дзіцячыя мастацкая школа, аматарскія мастацкія гурткі, клубы. Вызначэнне асноўных дызайн-элементаў і іх выкарыстанне ў канструяванні і аздабленні рэкламнага буклету, паштовага канверту, фірменных бланкаў дакументацыі: фірменны колер, каляровае спалучэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПАТРАБАВАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

Студэнт прадстаўляе для прагляду афармленыя на паспарту наступныя вучэбныя працы.

1. Экслібрыс (станковая ілюстрацыя ): арыгінальнае выкананне і некалькі варыянтаў адбіткаў камп'ютарнай выявы – фармат А-3
2. Завершаны твор станковай графікі ў адной з арыгінальных тэхнік (аловак, туш, манатыпія і інш.) з падрыхтоўчым матэрыялам. (Фармат А-3)
3. Таварны знак у арыгінальным і друкаваным выкананні ў некалькіх варыянтах Фармат А-3
4. Аб'екты фірменнага стылю: фірменны бланк, рэкламная лістоўка або буклет, афармленне экстэр'еру будынка. Фармат А-2

ЛІТАРАТУРА


1. Баразна М.Р. Беларуская кніжная графіка 1960 – 1990-х гадоў. – Мн., 2001.
2. Беларуская станковая графіка: [Альбом] / Аўт.-склад. В.Ф.Шматаў.—Мн., 1978.
3. Беларускі саюз мастакоў: Энцыклапедычны даведнік /Аўт.-склад. Б.А.Крэпак і інш. –Мн., 1998.
4. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1 – 6.—Мн., 1987 – 1994.
5. Дробаў Л.Н. Графіка Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзя.– Мн., 2000.
6. Орлова М.А. Искусство Советской Белоруссии.—М., 1960.
7. Рынкевіч У.І. Мастацтва акварэлі. – Мн., 2001.
8. Шматаў В.Ф. Беларуская графіка. 1917 – 1941. – Мн., 1975.
9. Шматаў В.Ф. Сучасная беларуская графіка (1945 – 1977).—Мн., 1979.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Шматаў В.Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI – XVIII стагоддзяў. – Мн., 2000.
11. Червонная С., Богданас К. Искусство Литвы. – Л., 1972.
12. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т. 1 – 5 .– Мн., 1984 – 1987.
13. Хиллман Кертис  Flash Web-дизайн. Опыт профессионалов (для версии 5)
, 2002
14. Александр Кириленко Самоучитель по компьютерной верстке. QuarkXPress 4.x. PageMaker 6.5, 2001
15. Донни О'Квин Допечатная подготовка. Руководство дизайнера, 2001
16. Фотография, реклама, дизайн на компьютере. Самоучитель Виталий Шнейдеров, 2002
17. Виктор Мураховский Компьютерная графика. Популярная энциклопедия, 2002
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадатак 1

СПІС ПЫТАННЯЎ ДА САМАКАНТРОЛЮ

1. Графіка ў структуры відаў выяўленчага мастацтва.
2. Спецыяльная тэрміналогія графікі.
3. Графіка як аб'ект мастацтвазнаўства.
4. Ксілаграфія: віды, тэхналогія, спецыфіка вобраза.
5. Лінарыт: віды, тэхналогія, спецыфіка вобраза.
6. Разцовая металагравюра: віды, тэхналогія, спецыфіка вобраза.
7. Афорт: віды, тэхналогія, спецыфіка вобраза.
8. Літаграфія: віды, тэхналогія, спецыфіка вобраза.
9. Малюнак: віды, эвалюцыя ў матэрыялах, спецыфіка вобраза.
10. Вытокі станковай графікі ў старажытнай рукапіснай кнізе.
11. Пачаткі станковай графікі ў беларускіх старадруках XVI – XVII стст.
12. Станковая графіка XVII ст.
13. Навучанне графічнаму мастацтву ў Віленскім універсітэце.
14. Медзярыт і афорт першай паловы XIX ст.
15. Літаграфія XIX ст.
16. Станковая і ілюстрацыйная ксілаграфія XIX ст.
17. Краязнаўчы і этнаграфічны малюнак XIX ст.
18. Акадэмічны і эскізны малюнак першай паловы XIX ст.
19. Партрэтны і сюжэтны малюнак другой паловы XIXст.
20. Віленская рысавальная школа І.Трутнёва.
21. Дэмакратычныя тэндэнцыі ў графіцы канца XIX – пачатку XX ст.
22. Графіка ў мастацкім жыцці Беларусі 1919 – 1940 гг.
23. Графіка віцебскага авангарда.
24. Малюнак у творчасці мастакоў старой акадэмічнай школы.
25. Навучанне графічнаму мастацтву ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме.
26. Віцебская ксілаграфія 1920-х гадоў.
27. Чорна-белая і каляровая лінагравюра даваеннага перыяду.
28. Афорт і літаграфія 1920 – 1930-х гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

29. Арыгінальная графіка міжваенных дзясяцігоддзяў.
30. Графіка ў мастацкім жыцці Беларусі ў ваенны час і пасляваенны перыяд.
31. Хранікальна-дакументальны малюнак перыяду Вялікай Айчыннай вайны.
32. Акадэмічны і эскізны малюнак пасляваеннага перыяду.
33. Рэпартажны малюнак і акварэль пасляваеннага перыяду.
34. Эстамп пасляваеннага перыяду.
35. Графіка ў мастацкім жыцці Беларусі ў 1960 – 1985-я гг.
36. Сучасная лінагравюра.
37. Сучасная літаграфія.
38. Сучасная акварэль: графічная і жывапісная тэндэнцыі развіцця.
39. Віцебская школа акварэлі.
40. Сучасны афорт.
41. Сучасны алоўкавы і пёравы малюнак.
42. Сучасная манатыпія.
43. Графіка ў мастацкім жыцці Беларусі ў 1985 – пачатку 2000-х гг.
44. Падрыхтоўка мастакоў графічнай спецылізацыі ў Беларусі.
45. Змешаныя і рэдкія тэхнікі сучаснай станковай графікі.
46. Фальклорны кірунак тэматычна-вобразнай сферы станковай графікі.
47. Сімвалізм і метафарызм у сучаснай графіцы.
48. Праблемы захавання і вывучэння беларускай станковай графікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

ГРАФІКА (станковая, прыкладная)

Праграма вучэбнага курсу

Рэдактары

Падп. у друк Фармат 60х84 1/16. Папера пісчая № 2.

Ум. друк. арк. Ул.- выд. арк. Тыраж 30 экз. Заказ

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

Ліцэнзія ЛВ № 283 ад 22.04.1998 г.

Надрукавана на рызографе Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

Ліцэнзія № 496 ад 25.06.2002 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ